# Па-зямляцку шчыра

2008 год аб'яўлены ЮНЕСКА годам В. Дуніна-Марцінкевіча — паэта, драматурга, тэатральнага дзеяча.

Літаратурны вечар пад назвай "Ён першы сеяў зярняты..." прайшоў у Магілёве ў Палацы культуры вобласці і быў прысвечаны 200-й гадавіне з дня нараджэння выдатнага класіка беларускай літаратуры Віцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Правёў яго клуб "Натхненне" пры падтрымцы Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны і цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя К. Маркса.

Мерапрыемства праходзіла ў зале, якая была аформлена ў стылі XIX стагоддзя: беларускія ручнікі, нацыянальнае адзенне, беларуская народная музыка. Была прадстаўлена кніжная выстава "Болып за ўсё я бацькоўскаму краю адданы...", дзе дэманстравалася літаратура аб жыцці і творчасці беларускага дудара. Мультымедыйная прэзентацыя жыцця і творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча на вялікам экране пазнаёміла гледачоў з яго радаводам, з мясцінамі, дзе праходзіў жыццёвы шлях вялікага майстра.

З горадам Магілёвам цесна звязаны лёс В. Дуніна-Марцінкевіча.

Будучы пісьменнік і драматург выхоўваўся ў сям'і свайго дзядзькі Станіслава Богуша-Сестранцэвіча, таму з дзяцінства і юнацтва добра запомніў рэаліі жыцця горада XIX стагоддзя. Па нейкіх прычынах пакінуўшы Пецярбургскі універсітэт, В. Дунін-Марцінкевіч звязаў сваё жыццё з Мінскай губерніяй, але героем яго твораў стала і тагачасная Магілёўшчына. У вершаванай аповесці "Гапон" даецца надзвычай каларытнае апісанне Магілёва:

*У горадзе Магілёве,*
*Пры шырокім пры Дныпрэ,*
*Гудзіць — кабы шэршні ў дрэве,*
*Кіпіць — як бы у катле.*
*Там вуліцаю пан гоніць,*
*Каляска стралой ляціць,*
*"А хварысь, падзі!" — крычыць.*
*Тут сустрэнеш калымажку,*
*Вот конікі! глядзь! кругом*
*Гладкі — ляцяць уразмашку;*
*Гэта пэўна эканом.*

Трэба адзначыць, што падчас вечара гледачы мелі магчымасць даведацца пра старадаўні Магілёў часоў жыцця В. Дуніна-Марцінкевіча. Аб гэтым расказаў кандыдат гістарычных навук Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта харчавання Ігар Пушкін.

У праграме вечара былі прадстаўлены драматычная сцэнка "Неспадзяванка для майстрыні", маналог Марысі з фарс-вадэвіля "Пінская шляхта", маналог Юліі "Ой, думкі, ой, мары дзіцячага веку" з оперы "Ідылія", маналог Адэлі "О, салодкія, залатыя сны маладога ўяўлення!" з фарс-вадэвіля "Залёты", успаміны Ядвігіна Ш. Усе нумары выконвалі артысты народнага тэатра Палаца культуры вобласці пад кіраўніцтвам А. Кусковай.

Прагучала песня на словы В. Дуніна-Марцінкевіча (музыка Э. Зарыцкага) "Партрэт Стэфы" ў выкананні студэнткі МДУ імя А.Куляшова Яўгеніі Крэпавай.

Вучні ДШМ № 2 імя М. Салдатава ўразілі публіку ігрой на цымбалах.

Такія творцы, як В. Дунін-Марцінкевіч, шануюцца ў кожным народзе. А падзеі, мясціны, звязаныя з іх жыццём і творчасцю становяцца дарагімі і блізкімі кожнаму жыхару нашай краіны, а асабліва нам, яго землякам.

**Ірына ЦІНЯКОВА,**
**галоўны бібліятэкар Магілёўскай цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя К.Маркса**